АФГАНІСТАН БАЛІЦЬ У НАШЫХ ДУШАХ

25 гадоў прайшло з дня выводу савецкіх войскаў з Афганістана. І дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў для беларусаў асабліва важны. Больш за 770 нашых хлопцаў не вярнуліся дадому.

Па традыцыі 15 лютага ўдзельнікі афганскай вайны, іх жонкі, дзеці і ўнукі сабраліся на мінскім востраве Мужнасці і Смутку, каб ушанаваць памяць загінулых вайскоўцаў, ускласці кветкі да помніка воінам-інтэрнацыяналістам.

Надзея БУЖАН, фота аўтара.

500 дзён вайны

Аб тым, што сын ваюе ў «гарачай» кропцы, маці даведалася толькі праз год яго службы

25 гадоў таму Мікалай Калачоў вярнуўся дахаты ў родную вёсачку пад Шкловам, што на Магілёўшчыне. На памяць аб Афганістане ў целе засталіся асколкі ад гранаты, але душа спявала: жывы! Той апошні дзень на чужой зямлі ён памятае, здаецца, да апошняй хвіліны. Як збіраліся, як ехалі... «Гэта было 15 лютага пасля абеду, — удакладняе Мікалай. — Мясцовыя суправаджалі нас са зброяй у руках. Казалі: «Вы — добрыя, але ж вас могуць забіць». Не ведаю, наколькі яны былі шчырымі ў сваіх словах, але камандзіры нас загадзя папярэдзілі: маўляў, ніякіх феерверкаў і стрэлаў».

...На сустрэчу Мікалай прыйшоў з вялізным армейскім альбомам. Чорна-белыя здымкі, на жаль, крыху выцвілі. Але ўсё роўна, гледзячы на іх, адчуваеш цяжкі подых афганскай вайны.

Мікалай прызваўся на службу ў памежныя войскі вясной 1987 года. «Касіць» ад арміі ў яго нават і ў думках не было. Аднавяскоўцы засмяялі б, падумалі б, што хворы. Тым больш што старэйшы брат служыў у Германіі, і Мікалай яму вельмі зайздросціў. Пра тое, што можа трапіць у Афганістан, не думалася. А вось маці, здаецца, нешта адчувала — плакала, калі развітвалася з сынам. Ён яе супакойваў: «Не на вайну ж іду». Быццам бы накаркаў.

Службу прыйшлося несці на таджыкска-афганскай мяжы. Пасля «стажыроўкі» ў вучэбна-баявым цэнтры «Халкаяр» (дзе навабранцам, акрамя іншых асноў, далі некалькі «ўрокаў» вядзення афганскага бою) спачатку служыў сапёрам у Тулукане, а потым выконваў баявыя заданні ў складзе дэсантна-штурмавой мабільнай групы. Яна «прыкрывала» граніцу і «працавала» на тэрыторыі Афганістана.

— Баявое хрышчэнне адбылося падчас першага вылету, — успамінае Мікалай. — Толькі зрабілі прывал, як раптам нешта прасвістала над галавой і грымнуў выбух. Стараслужачыя ўсё зразумелі, а мы, птушаняты жаўтаротыя, напалохаліся. Бронекамізэлек не было — чым не жывая мішэнь для ворага? Каленкі трэсліся ад страху па-сапраўднаму.

Аперацыі за два гады службы былі розныя: адны доўжыліся некалькі гадзін, іншыя вымушалі месяцамі жыць у акопах. Душманы ведалі сваю тэрыторыю як табліцу множання, і змагацца з імі было цяжка. «Аднойчы ўдзельнічалі ў захопе двух бандытаў, — кажа Мікалай. — Яны былі літаральна перад намі і раптам зніклі, як пад зямлю праваліліся».

Здаралася, што і свае памылкі дапускалі. Быў выпадак, калі дэсант «выкінулі» не туды. Але гэта стала зразумела, калі верталёт ужо падняўся ў паветра. Прыйшлося рабіць не вельмі блізкі пераход. Ды яшчэ з заплечнікам, які важыць не менш за 40 кілаграмаў. І гэта пры тым, што ўнутры толькі самае неабходнае — зброя, боепрыпасы, асабістыя рэчы. Добра, што савецкія БТРы сустрэлі на шляху. Ну як тут сваіх не падкінуць? Мікалай таксама падсеў на адзін і, нездарма ж кажуць, што свет цесны, — аказаўся побач з аднагрупнікам па вучылішчы, якое скончыў да арміі.

Да паходных умоў салдату не прывыкаць. Але бадай месяц жыць на могілках — не кожны вытрымае. «Спалі ў склепе, пад зямлёй, — дзеліцца жахлівымі падрабязнасцямі суразмоўца.— Трун я не бачыў, але спачатку было непрыемна. Потым неяк прывык. Нават кашмары не сніліся».

Да клімату таксама прыходзілася прыстасоўвацца. Зімой было золка, вецер прабіраў да самых касцей. Але яшчэ больш вымотвала спёка. Быў выпадак, калі ад цеплавога ўдару памёр салдат. А такое, калі навабранцы ў спякоту страчвалі прытомнасць, здаралася не раз.

Часам і без ежы заставаліся. Аднойчы правізія скончылася, а верталёты не прыляталі: душманы не давалі ім сесці. Прыходзілася паляваць на мясцовых рэптылій. А іх там было шмат. Захаваўся здымак, дзе салдаты трымаюць у руках змяю. У смажаным выглядзе яна нечым нагадвае рыбу. А яшчэ давялося пакаштаваць чарапахавы суп. Ён, кажуць, на аматара, але з галадухі чаго толькі не з'ясі! Вось толькі афганскі рыс прыйшоўся недаспадобы. На від ён звычайны, але, калі пачынаеш варыць, пах ад яго, мякка кажучы, не вельмі прыемны.

Мясцовыя жыхары, якія прыязна ставіліся да савецкіх міратворцаў, абменьваліся з імі прадуктамі, звярталіся па дапамогу да іх фельчаркі. Хоць гэтая «дружба» афіцыйна забаранялася, стасункі былі даволі цеснымі. У Мікалая нават захавалася некалькі фотаздымкаў з «суседзямі».

— А гэта душманы, — паказвае ён фота, дзе стаяць загорнутыя ў накідкі людзі з вінтоўкамі. — З ліку так званых «добрых». Маглі нават папярэдзіць, калі нам пагражала небяспека.

На старонках салдацкага альбома шмат цікавых фота. Вось грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, дзе Мікалаю дзякуюць за мужнасць пры выкананні інтэрнацыянальнага доўгу. «Будзем спадзявацца, што мы яго выканалі, — кажа Мікалай. — Адзін знаёмы бравіраваў: «Падумаеш, Афган! Я туды з задавальненнем паехаў бы». А вось я не хацеў бы туды вярнуцца. Раней жартавалі: пратрымайся там 2 дні — і атрымаеш пасведчанне, што служыў у Афгане.»

Выпадкаў, калі ў салдата не вытрымлівалі нервы, таксама хапала. Мікалай узгадаў, як адзін «дзед» стаў здзекавацца з маладога, прымушаў паўзці. А той схапіў зброю, нацэліў на яго і скамандаваў: «Сам паўзі!» На хлопца страшна было глядзець: збялеў увесь, затросся. Напружанасць была ўжо ад самой службы, а тут яшчэ гэты «дзед».

Вайна ёсць вайна, і вяртаюцца з яе, на жаль, не ўсе. Аднойчы верталёт, з якога хвіліну таму высадзілася баявая група, збілі тут жа на вачах. Яшчэ быў выпадак, калі сябар атрымаў асколачнае раненне, але па дарозе да шпіталя памёр. Мікалаю пашчасціла: граната разарвалася недалёка ад яго, балюча секанула па целе асколкамі, кантузіла. Яго і яшчэ чатырох параненых на верталёце даставілі ў шпіталь Душанбэ. А выжылі толькі ён ды яшчэ адзін хлопец.

— Вось мае сябры, якія не вярнуліся дадому, — паказвае Мікалай фотаздымкі 26-гадовай даўнасці, з якіх глядзяць сімпатычныя маладыя твары. — Гэта — Алег Чумак. Разам лячыліся ў шпіталі ў Душанбэ. Калі даведаўся, што яго не стала, не мог паверыць. Асколак трапіў яму ў пераноссе, а потым перамясціўся ў мозг... Пасля гэтага ўсіх нас пачалі правяраць, галовы «свяціць». Дзе раней былі? А вось гэта — прапаршчык Каваленка, таксама загінуў ад разрыву гранаты. У тым жа баі. Твар разнесла так, што жахліва было глядзець.

Пасля ранення Мікалаю далі 10 дзён камандзіроўкі ў якасці заахвочвання. Дома пра яго службу ў Афганістане яшчэ не ведалі, хаця ён ужо год там ваяваў. Можа, гэта так і засталося б сакрэтам, калі б ён не прагаварыўся стрыечнаму брату. Той падзяліўся з бацькам, а бацька з сястрой — маці салдата. У жанчыны істэрыка пачалася, не хацела адпускаць сына. Ледзь супакоілі.

Ёсць у армейскім альбоме чорная старонка, куды ўпісаны прозвішчы загінулых падчас службы ў часці з 1981-га па 1988 год. У спісе больш за 40 чалавек. Але гэта не ўсе, як кажа Мікалай. Калі пачаўся вывад войскаў, салдаты ўсталявалі ў гонар загінулых таварышаў невялікі помнік.

З Афганістана Мікалай прывёз дадому парашут. Але як і дзе яго страціў, нават і не памятае. Шкада вельмі. Там былі пазначаны адрасы сяброў і кропкі баявых аперацый. Быў яшчэ прабіты куляй металічны магазін ад вінтоўкі — гэты кавалак металу выратаваў яму жыццё, прыкрыў грудзі. Альбом і той крыху картрапаў у дзяцінстве старэйшы сын — цягаў яго ўсюды, нават спаў з ім.

Мікалай — аптыміст. Ён смяецца і жартуе, быццам тыя жахі не з ім адбываліся. Быццам два баявыя медалі, адзін з якіх — «За адвагу», а другі — «За адзнаку ў ахове дзяржаўнай мяжы СССР», яму проста так даліся.

...15 лютага ён заўсёды ходзіць на сустрэчу з баявымі сябрамі. Гэта святое. Успамінаюць, як марылі, што, калі вернуцца, нарэшце выспяцца і купяць адразу некалькі маразільнікаў, каб расчыніць іх і злавіць кайф ад холаду: афганская спёка ўсіх дастала. Але дома пра ўсё гэта хутка забылася. Свае сцены, вядомая справа, добра лечаць зраненую вайною душу... Цяпер Мікалай жыве ў роднай Камароўцы разам з жонкай і двума сынамі. І лічыць сябе шчаслівым чалавекам.

Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.

■ Праекты з суседзямі

СПАДАРОЖНІК... ДЛЯ ГАСПАДАРКІ

На інтэрнэт-відэабрыфінгу «Навукова-тэхнічныя праграмы Саюзнай дзяржавы: рэзультаты і перспектывы рэалізацыі», арганізаваным Нацыянальным прэс-цэнтрам, Пётр ВІЦЯЗЬ, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук, падкрэсліў, што Беларусі патрэбны тыя напрамкі навуковых даследаванняў, у якіх зацікаўлены рынак.

Акадэмія навук супрацоўнічала з расійскімі калегамі з першых дзён стварэння Саюзнай дзяржавы. Яна праадзіць сумесныя даследаванні больш чым з 70 навуковымі цэнтрамі свету, тым не менш, ільвіная доля ўсіх праграм выконваецца менавіта з Расіяй.

Па словах акадэміка, саюзныя праграмы рэалізуюцца перш за ўсё ў тых сферах, якія найбольш запатрабаваны ў абедзвюх краінах. Асаблівую ролю іграюць праекты ў касмічнай сферы. Вынікам адной з саюзных праграм стаў беларускі спадарожнік, які цяпер паспяхова выкарыстоўваецца для розных даследаванняў. Так, саюзная праграма «Нетры», якая рэалізуецца пры дапамозе здымкаў, атрыманых з касмічнага апарата, дапамагае разведваць карысныя выкапні. «Сёння мы цудоўна разумеем, што прыродныя рэсурсы скарачаюцца, і, каб падтрымліваць аб'ёмы вытворчасці, неабходна з найменшымі стратамі шукаць новыя крыніцы», — адзначыў навуковец.

Акадэмік звярнуў асаблівую ўвагу на той факт, што навуковыя даследаванні ў касмічнай сферы маюць прыкладны характар. Дамоўленасці ёсць з Міністэрствам сельскай гаспадаркі (здымкі з космасу даюць магчымасць ацаніць плошчу лясоў, вызначыць маштабы высечкі лесу), з Міністэрствам сельскай гаспадаркі (аналіз сельскагаспадарчых угоддзяў), Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях (ацэнка маштабу стыхійных бедстваў). Пётр Віцязь адзначыў, што якасць атрыманых фотаздымкаў даволі высокая — дазваляе апазнаваць аб'екты на паверхні Зямлі памерам менш чым два метры.

На працягу 2014 года будзе рэалізавана 10 праграм Саюзнай дзяржавы, якія тычацца пагранічнай бяспекі, мікрасістэмнай тэхнікі, распрацоўкі сістэмы стандартызацыі касмічнай тэхнікі, абароны агульных інфармацыйных рэсурсаў Беларусі і Расіі на аснове высокіх тэхналогій, забеспячэння харчовай бяспекі (праца над вывядзеннем якасных сартоў бульбы і тапінамбура), пераадолення наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

Пётр Віцязь таксама выказаў спадзяванні, што ў будучыні з'явяцца сумесныя праекты ў галіне бія- і нанатэхналогій, а таксама медыцыне.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

■ Ахова працы

БЯСПЕКА НА РАБОЦЕ — СПРАВА НЕ ТОЛЬКІ НАЙМАЛЬНІКА...

Па звестках Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, на канец 2012 года ў краіне амаль 800 тысяч працоўных месцаў мелі шкодныя ўмовы — гэта амаль трэцяя частка ад усіх.

За 2013 год палепшаны ўмовы больш чым на 55 тысячах рабочых месцаў, у адпаведнасць з гігіенічнымі нормамі прыведзена 27 тысяч. Летась праведзена 539 экспертыз умоў працы, па выніках якіх наймальнікам выдадзена 77 прадпісанняў па ліквідацыі парушэнняў заканадаўства. Самае распаўсюджанае парушэнне — завышэнне адзнак у параўнанні з фактычным станам умоў працы для захавання кампенсацый, якія раней прадастаўляліся работнікам. З 11 работнікамі адноўлены законныя правы на прадастаўленне гарантый і кампенсацый за працу са шкоднымі ці небяспечнымі ўмовамі.

Тым не менш летась на вытворчасці ў краіне загінула 168 чалавек (у 2012 годзе — 169), сумнае «лідарства» — у Мінскай, Віцебскай, Гродзенскай абласцях. Аднак часта выпадкі траўматызму і гібелі на працоўным месцы абумоўлены не толькі парушэннем нарматываў арганізацыі працы. Бяспека залежыць і ад саміх работнікаў. У прыватнасці, актуальным застаецца праблема ўжывання спіртных напояў і знаходжанне на працы ў нецвярозым стане. На думку **намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Анатоля ТОЗІКА,** стаўленне наймальнікаў да работнікаў, якія п'янствуюць на вытворчасці, павінна быць больш строгае.

«З якім запісам у працоўнай кніжцы звальняюцца работнікі, заўважаныя ў п'янстве на рабочым месцы? Чаму яны дрэйфуюць з прадпрыемства на прадпрыемства? У працоўнай кніжцы павінен быць адпаведны запіс, каб наймальнік ведаў, каго ён прымае на работу», — лічыць віцэ-прэм'ер.

Паводле яго слоў, у краіне створана дастатковая нарматыўная прававая база для таго, каб забяспечыць элементарны парадак на рабочых месцах. «Расхлябанасць нясе сур'ёзную пагрозу эфектыўнасці работы эканомікі», — заўважыў Анатоль Тозік.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■

■ Глыбінка

«ПРОСТЫЯ РЭЧЫ» ГАСЦІННАСЦІ

Беларускае грамадскае аб'яднанне «Адпачынак у вёсцы» ў рамках праекта USAID/ПРААН «Мясцовае прадпрымальніцтва і эканамічнае развіццё» праводзіць інфармацыйна-адукацыйную кампанію «Простыя рэчы», каб папулярызаваць аграэкатурызм як бізнес і адпачынак.

— 2014-ы аб'яўлены ў Беларусі Годам гасціннасці. І дзе, як не ў нашай вёсцы, можна адчуць сапраўдную беларускую гасціннасць? Менавіта на простых і спрадвечных каштоўнасцях заснаваны аграэкатурызм: фальклор, рамёствы, абрады, ежа і, вядома ж, душэўнасць і гасціннасць нашых людзей. Перш за ўсё мы хацелі б нагадаць суайчыннікам, і не толькі ім, што ў Беларусі, у нашай глыбінцы, можна добра і цікава адпачываць. І, акрамя таго, стварыць тут свой бізнес. Гэта цудоўная тэма для самарэалізацыі і прадпрымальніцтва (аграсядзібы, кавярні, зялёныя маршруты, пракат байдарак і веласіпедаў, рамесніцтва і г. д.), — кажа **старшыня праўлення аб'яднання «Адпачынак у вёсцы» Валерыя КЛІЦУНОВА.**

У рамках кампаніі «Простыя рэчы» цяпер распрацоўваецца серыя сацыяльных плакатаў, прысвечаных розным аспектам аграэкатурызму, якія будуць размешчаны ў гарадах нашай краіны. Плануецца арганізацыя валанцёрскіх груп сярод студэнтаў ВНУ і каледжаў для працы на аб'ектах аграэкатурызму, «Летніка рамёстваў», правядзенне экалагічных акцый з прыцягненнем дзяцей і моладзі, канферэнцыі «Творчая лабараторыя зялёнага турызму». Таксама пройдзе фестываль Organic party («Зялёнае свята»), прысвечаны традыцыйнай кухні, якая заснавана на экалагічных прадуктах, і пытанням менеджменту, сертыфікацыі агратурыстычных аб'ектаў у гэтай сферы.

Той, хто зацікавіўся кампаніяй «Простыя рэчы», можа паведаміць пра гэта па адрасе info@ruralbelarus.by.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

ЛЯСЫ ДЛЯ БУДУЧЫХ ПАКАЛЕННЯЎ

Сёлета лясгасы краіны плануюць стварыць амаль 22 тысячы гектараў новых лясоў. Для гэтага спатрэбіцца каля 140 мільёнаў штук стандартных сеянцаў і саджанцаў.

Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі, неабходным пасадачным матэрыялам усе лясгасы забяспечаны цалкам і нават з запасам. Сёння ў наяўнасці ёсць 302 мільёны штук рознага пасадачнага матэрыялу, у тым ліку 282,3 мільёна штук сеянцаў і 19,7 мільёна штук саджанцаў. Усяго — звыш 280 відаў і формаў драўнінных раслін.

Высаджвацца ў асноўным будуць хваёвыя пароды дрэў — сасна і елка, а таксама чарэшчаты дуб. Акрамя таго, плануецца пасадка еўрапейскай лістоўніцы, звычайнага ясеня, бярозы, ліпы і іншых парод. Частка пасадачнага матэрыялу, што застанецца, пойдзе на экспарт, нейкую колькасць выкарыстаюць у гадавальніках для дарошчвання — каб у далейшым мець буйнамерны пасадачны матэрыял.

Сёлетняй вясной будзе створана таксама 26,5 гектара лесанасенных плантацый і 305 гектараў плантацый хуткарослых драўнінна-хмызняковых парод для забеспячэння паліўнай драўнінай цеплаэнергетычных установак, якія працуюць на мясцовых відах паліва.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Інфарм-укол

НАВОШТА ЖАНЧЫНЫ ТАК РОБЯЦЬ?

Прычыны, па якіх жанчыны перарываюць цяжарнасць, добра вядомыя, у іх ёсць звычайна сацыяльны і эмацыянальны бок. Клінічны псіхолаг, выкладчыца Інстытута Юнга (Швейцарыя) Эва Паціс Зоя лічыць: вопыт перарывання цяжарнасці раскрывае ў жанчыне яе сапраўднае «Я».

Аборт выбіраюць жанчыны, цудоўна інфармаваныя аб сродках кантрацэпцыі. Гэта ў пэўным сэнсе сведчыць аб тым, што разам з прычынамі ёсць мэта, якой (часцей несвядома) жанчына мае намер дасягнуць. Аборт можа азначаць, што маладая жанчына жадала пераканацца ў сваёй здольнасці зацяжарацъ. Аднак навошта патрэбна такая жорсткая праверка практыкай? Спадарыня Эва Зоя мяркуе, што гэта вынік адсутнасці ў сучасным грамадстве абрадаў «пасвячэння» маладых жанчын (якія існавалі ў антычнасці і сярэднявеччы). На рацыянальным узроўні жанчына ведае, што можа нарадзіць. Але ёй неабходна цялеснае, фізіялагічнае перажыванне. У выніку цяжарнасці і аборту жанчына атрымлівае канчатковы адказ: «Я магу зацяжарацъ і нарадзіць».

Маладыя жанчыны часта цяжараць перад заканчэннем ВНУ і абаронай дыплома, калі перад імі востра паўстае выбар — захаваць цяжарнасць і стаць маці або зрабіць аборт і заняцца кар'ерай. Пагаджаючыся аборт, яны выбіраюць работу і творчы шлях. Прынамсі, на пэўным этапе жыцця.

Аборт — гэта яшчэ і магчымасць перажыць максімальна драматычную сітуацыю, каб змяніца. Многім неабходна падвергнуць сябе балючаму выпрабаванню, каб адчуць сябе дарослымі. Наўрад ці існуе больш моцны сродак «выйсці з дзяцінства», чым забіць у сабе дзіця. Многія жанчыны, з якімі давялося працаваць Эве, казалі, што ў выніку развіталіся з дзіцячым уяўленнем аб тым, што ў іх з'явіцца новая лялька. Гэта быў адзіны спосаб адмовіцца ад такой інфантыльнай фантазіі. Але галоўнае, што аборт паўплываў на светапогляд жанчын і стаўленне да свету: на першы план выйшлі тыя складнікі асобы, якія раней былі схаванымі.

Дык чаму ж сёння, калі і роды досыць бяспечныя, і кантрацэптывы даступныя, і маці не перарываюць кар'еру нават пасля нараджэння некалькіх дзяцей, аборты ўсё ж досыць частыя? Таму што жанчыне неабходна як мінімум два «таінствы». Поўнае «пасвячэнне» — роды — ператварае жанчыну ў маці, а аборт як частковае «пасвячэнне» дазваляе ёй увайсці ў новае жыццё, стаць сабой. Бо ўсё гэта вельмі страшна — адхіліць каштоўнасці, уласцівыя грамадству, і выявіць сваім учынкам пагарду да ўсіх маці. Тых, хто адважыўся на аборт, і сёння асуджаюць, іх прыгнятае пачуццё віны. І ўсё ж такі жанчына кажа «так» самой сабе.

Гэтая лекцыя была прачытана на міжнароднай канферэнцыі Маскоўскай асацыяцыі аналітычнай псіхалогіі.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

■ Запрашальнік

Песнапенні «Каложскага благавеста»

Больш за 30 царкоўных і свецкіх калектываў з Беларусі, Расіі, Украіны, Арменіі, Польшчы і Румыніі выступаюць у Гродне на XIII міжнародным фестывалі праваслаўных песнапенняў «Каложскі благавест».

Праходзяць прэзентацыі выстаў «Нашы храмы» і «Праваслаўная Сербія вачамі беларусаў», «Вялікі цудатворац», вечар духоўнай паэзіі і аўтарскай песні, а таксама прагляд і абмеркаванне фільмаў «Ікона» і «Вялікі пост». У рамках фестывалю прэзентуецца кніга Ларысы Густавай «Царкоўныя спевы. Беларуская пеўчая культура праваслаўнай традыцыі». Фестывальныя канцэрты (білеты прадаюцца ў гродзенскіх цэрквах) і конкурсныя выступленні (іх наведванне бясплатнае) распачнуцца 19 лютага.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

■ Спорт-тайм

АЗАРАНКА ПЕРАСКОЧЫЛА НА 4-Ы РАДОК

БАТЭ паспяхова згуляў з «Зенітам», гандбольнае «Дынама» не прабілася ў плэй-оф Лігі чэмпіёнаў, а баскетбольныя «Цмокі» пацярпелі яшчэ адно паражэнне ў Адзінай лізе ВТБ. «Звязда» ўзгадвае 4 асноўныя для Беларусі спартыўныя падзеі, якія адбыліся гэтымі днямі за межамі алімпійскага Сочы.

Фота БЕЛТА.

1. Мінскае «Дынама» правяло апошні ў гэтым сезоне хатні матч гандбольнай Лігі чэмпіёнаў **(на фота)**. На жаль, парадаваць балельшчыкаў перамогай у падапечных Борыса Дэніча не атрымалася. За лічаныя секунды да фінальнай сірэны беларусы перамагалі македонскі «Металург» у адзін мяч, аднак балканцы паспяхова выканалі 7-метровы штрафны кідок і зрабілі лік нічыйным — 23:23. 23 лютага «Дынама» правядзе свой заключны матч у Лізе чэмпіёнаў. Яго саперлік — швейцарскі «Вакер». Праўда, ужо дакладна вядома, што ў плэй-оф мінчане не трапяць. Шчаслівую чацвёрку з групы «С» склалі іспанская «Барселона», французскі ПСЖ, македонскія каманды «Вардар» і «Металург».

2. Баскетбольны клуб «Цмокі» таксама не здолеў парадаваць сваіх гледачоў перамогай. Пад зводамі «Мінск-Арэны» сталічнікі ўступілі ўкраінскаму «Азоўмашу» 98:102. Апошнюю перамогу ў Адзінай лізе ВТБ беларусы атрымалі ажно ў лістападзе, калі на хатнім паркеце перайгралі казахскую «Астану»...

3. Падчас трэніровачных збораў у Турцыі барысаўскі БАТЭ правёў таварыскі матч з піцерскім «Зенітам». На фоне «зорнага» саперніка барысаўчане выглядалі даволі ўпэўнена і завяршылі матч нулявой нічыёй. Дарэчы, цікавыя футбольныя навіны прыходзяць не толькі з турэцкага берага, але і з Беларусі. Футбольны клуб «Партызан», які выступае ў другой лізе, у чарговы раз здзівіў грамадскасць. Нагадаем, што летась яго ўзначаліў нямецкі спецыяліст Карл Альвін Штрыгель, а літаральна на днях галоўным трэнерам самабытнай каманды стаў Андрэй Лаўрык, былы абаронца футбаліст зборнай Беларусі.

4. У абноўленым рэйтынгу жаночай тэніснай асацыяцыі Вікторыя Азаранка знаходзіцца на чацвёртым радку. Пасля турніру ў катарскай Досе беларуску ў спісе абышла кітаянка Лі На і палячка Агнешка Радваньска. На першым месцы — Серэна Уільямс.

Тарас ШЧЫРЫ

■